і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. – Мінск, 2020. – С. 133–137.

3. *Лобачевская, О. А.* Расписные стекла – между примитивом и кичем / О. А. Лобачевская // Примитив в изобразительном искусстве : материалы Всероссийской науч.-практ. конф. – М., 1994. – С. 47–54.

4. *Починова, Н. В.* Белорусская народная декоративная роспись / Н. В. Починова. – Минск : Выш. шк., 2005. – 174 с.

5. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1997. – 287 с.

6. *Флікоп, Г. А.* Абразы «на шкле» і «за шклом» у грэка-каталіцкіх храмах Беларусі ў XVIII–XIX стагоддзях / Г. А. Флікоп // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 25–26 крас., 2013 г. : у 5 ч. – Мінск, 2013. – С. 200–205.

7. *Фликоп-Свита, Г. А.* Иконопис на склі в Белоруссии: витоки ремесла, творчества 1920–1930-х рр. в музейных коллекциях и частных коллекциях / Г. А. Фликоп-Світа // Народознавчи зошити. – 2018 г. – № 2 (140). – С. 514–522.

8. *Шаура, Р. Ф.* Дэкаратыўны роспіс на шкле / Р. Ф. Шаура // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф. – М., 2003. – С. 235–241.

9. *Mironiuk-Nikolska, A.* Polska sztuka luowa // A. Mironiuk-Nikolska. – Sport I Turystyka. Muza SA. – Warszawa, 2010. – С. 160–161.

УДК [612.392.74:398]:165.212(476.7)

**У. В. Фалітарык,**

*магістр арт-менеджменту, загадчык метадычнага аддзела дзяржаўнай установы культуры «Іванаўскі раённы Цэнтр культуры і народных традыцый», г. Іванава, Рэспубліка Беларусь*

# СІМВОЛІКА ХЛЕБА Ў ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

**Анатацыя.** *Артыкул змяшчае асноўныя аспекты светапогляду заходніх палешукоў, звязанага з сімвалам хлеба, звяртаецца ўвага на яго выкарыстанне ў абрадавай культуры. Адрасуецца культуролагам і ўсім цікаўным людзям, якія займаюцца захаваннем этнакультурнай спадчыны.*

**Ключавыя словы:** *хлеб, сімвал, Заходняе Палессе, этнакультурная спадчына, абрадавая культура.*

**V. Folitarik,**
*Master of Art Management, Head of the Methodological Department of the state Institution of Culture «Ivanovo Regional Center of Culture and Folk Traditions», Ivanovo, Republic of Belarus*

# THE SYMBOLISM OF BREAD IN THE ETHNO-CULTURAL HERITAGE OF WESTERN POLESIE

**Abstract.** *The article contains the main aspects of the worldview of the Western Poleshukes, related to the symbol of bread, attention is drawn to its use in ritual culture. It is addressed to culturologists and all curious people who are involved in the preservation of ethno-cultural heritage.*

**Key words**: *bread, symbol, usage, Western Polesie, ethno-cultural heritage.*

Даследуючы асаблівасці этнакультурнай ідэнтычнасці Заходняга Палесся, неабходна звярнуцца да семантыкі і сімволікі некаторых рэчаў, якія ў дадзеным кантэксце маюць невычэрпную крыніцу вераванняў і светапоглядаў, звязаных з жыццём і штодзённым побытам заходніх палешукоў. Сярод шматлікіх сімвалічных рэчаў найважнейшым як у духоўным, так і матэрыяльным плане з’яўляецца хлеб.

Разглядаючы сімволіку і семантыку хлеба ў этнакультурнай спадчыне палешукоў, у першую чаргу неабходна звярнуцца да паходжання гэтага прадукту і этымалогіі назвы. У кожнага народа хлеб са старажытных часоў увасабляў і сімвалізаваў шчаслівае і доўгае жыццё, багацце, дабрабыт. Многія этнографы сцвярджаюць, што без хлеба немагчыма існаванне чалавека на зямлі.

Што тычыцца этымалогіі назвы «хлеб», то неабходна звярнуцца да слоўніка рускай фразеалогіі А. К. Бірыха і інш., дзе ёсць шэраг фразеалагічных зваротаў, якія паказваюць, што само слова выкарыстоўваецца ў розных значэннях.

Разгледзім тыя, што больш дапасаваны да традыцыйнай культуры палешукоў і беларусаў у цэлым.

Слова хлеб у значэнні «харчовы прадукт» ужываецца ў наступных фразеалагічных зваротах: «дзяліць хлеб-соль з кім» – аб цеснай дружбе; «забыцца хлеб-соль» – гэта значыць праявіць выключную няўдзячнасць таму, чыёй гасціннасцю калісьці карыстаўся; пячы хлеб у «печы суседа» – жыць з кім-небудзь, мець інтымную сувязь на баку; «падносіць хлеб-соль» («сустракаць хлебам-соллю») – аб добразычлівым прыёме, сустрэчы дарагіх, жаданых гасцей. Звычай гэты звязаны з абрадамі і павер’ямі. Напрыклад, на Масленіцу ў Старажытнай Русі ўсе сваякі адорвалі маладую пару хлебам, пірагамі, што сімвалізавала далучэнне да сямейнага стала, савет і любоў паміж роднымі і інш. [1].

Што тычыцца паходжання слова «хлеб», то існуе некалькі варыянтаў. Многія этымолагі лічаць, што яго радзіма знаходзіцца там, дзе і многіх

іншых звыклых і не вельмі слоў – у Старажытнай Грэцыі. З гістарычных крыніц вядома, што старажытныя грэкі выпякалі хлеб у спецыяльных гаршках – «клебаносах». Потым слова запазычылі ў грэкаў готы, старажытныя, цяпер зніклыя германцы. У іх яно загучала як «хлайфе» [6].

З другога боку, этымалогію слова «хлеб» некаторыя навукоўцы ўзводзяць да славянскага «хлябь». Роднасць слоў «хлеб» і «хлябь» цалкам прасочваецца. Першапачаткова збожжа проста вылузвалі і елі ў цэлым выглядзе. Затым навучыліся іх раздробваць, пераціраючы паміж двух камянёў і ўжываць у ежу ў выглядзе мукі, а з «прыручэннем» агню, пачалі дадаваць гэтую муку ў гаршкі пры варцы мяса. Атрымлівалася больш пажыўна і смачна. Пры адсутнасці мяса кіпяцілі ваду і дадавалі ў яе муку. Так паўсталі стравы, якія да гэтага часу распаўсюджаныя ў некаторых народаў: паэлья ў іспанцаў, мамалыга ў румын, кісель і цюра ў славян. Па ўсёй бачнасці, першапачатковая назва «хлеб» ужывалася менавіта да гэтай напаўвадкай субстанцыі з мукі, тое, што можна пахіснуць, каб насыціцца падчас адсутнасці больш істотнай ежы. Хрысціянская формула «хлеб наш надзённы даждь нам сёння», хутчэй за ўсё, і мела на ўвазе гэтую самую напаўвадкую субстанцыю. Вельмі доўга, грэючыся ля вогнішча, нашы продкі ведалі толькі такі «хлеб – хлябь» – поліўку з варанай мукі. Толькі шмат пазней, калі з'явіліся стацыянарныя печы, з'явіўся хлеб, вылеплены з густога цеста [5].

Неабходна адзначыць, што існуе яшчэ шмат меркаванняў наконт паходжання гэтай стравы. Аднак можна зрабіць выснову аб сімвалічнасці гэтага прадукту не толькі ў славян, але і ў іншых народаў свету.

Хлеб, як абярэг чалавека, суправаджаў яго ад самага нараджэння і да смерці. З хлебам звязана шмат звычаяў, традыцый і вераванняў. Заходнія палешукі з павагай і пашанай ставіліся да хлеба, менавіта таму, амаль што ва ўсіх абрадах каляндарнага і сямейна-бытавога цыклаў гэты прадукт быў галоўным сімвалам, да якога ставіліся з павагай і пашанай. Некаторыя носьбіты традыцыі параўноўваюць хлеб з жывым чалавекам, а ў дахрысціянскія часы яму нават пакланяліся як бажаству [5].

Неабходна вылучыць дзве асноўныя пазіцыі сімволікі хлеба ў заходніх палешукоў. Першая – самая старажытная, яна належыць да дахрысціянскага часу і мае сваю канкрэтную жыццёвую прыналежнасць. Палешукі пакланяліся хлебу не толькі як прадукту, але і ўсім тэхналагічным працэсам ад засеву нівы і да выпечкі. Нават і сёння сярод мясцовых жыхароў можна пачуць такую гаворку: «нывка в полы – хліб на столі», або «покрыла нывку на добрую спожывку, поможы Божэ убраты збожжэ, ой крыта крыта повная жыта». З гэтых выслоўяў добра бачна, што людзі пакланяліся ніве як зачатаму хлебу. Да нівы неслі пачастункі, кланяліся ёй і прасілі, каб яна добра зарадзіла хлеб. Усе абрады, звязаныя з аграрным годам, накіраваны выключна на ўрадлівасць збожжа і дабрабыт у сям'і.

«Драбінкі» – абрад, які бытуе ў аг. Псышчава Іванаўскага раёна. Ён ладзіўся на свята Узнясення Гасподня і быў накіраваны выключна на

зараджэнне нівы, сувязь яе з небам і на багаты ўраджай. Драбінкі – гэта маленькія, печаныя лесвічкі з сям'ю ступенькамі, якія сімвалізуюць сем крокаў да вечнага жыцця. Выпякаліся драбінкі да ўсходу сонца, а ў другой палове дня гаспадыня разам з іншымі жанчынамі з роду ішлі да нівы і неслі ёй у якасці ахвяравання спечаныя драбінкі. Абавязковым быў рытуал закопвання драбінкі ў зямлю. Мясцовыя жыхары свята верацьу магічную сілу сувязі зямлі з небам і прыродай і мяркуюць аб тым, што хлебныя каласы па драбінках, так як і Ісус Хрыстос, будуць падымацца да нябёсаў.

Пры выкананні гэтага абраду існуе шмат павер'яў, замоў і рытуальных абрадавых песень, якія выконваюцца выключна жанчынамі і маладымі дзяўчатамі. Акрамя драбінак да нівы нясуць малады парастак бярозкі, які сімвалізуе моц і прыгажосць зямлі: «Як быроза соком налываецца, так наша нывка нэхай до нэба подымаіцца» – з такімі прыгаворамі ўсаджваюць бярозку ў зямлю на край нівы, і стаяць яна павінна да пачатку жніва. Гэты абрад мае магічныя і архаічныя дзеі, якія бытуюць і па сённяшні дзень на тэрыторыі Заходняга Палесся і з'яўляецца ўнікальным узорам спалучэння язычніцкага і хрысціянскага веравызнанняў.

Усе рытуальныя дзеі жніўнага цыкла знаходзяць сваё адлюстраванне ў песенным і замоўным фальклоры палешукоў, які захаваўся ў жывым бытаванні да сённяшніх дзён. Сімвал хлеба як агульнага комплексу ад засевак да дажынак і выпечкі першага бохана прасочваецца праз велічанне яго як сэнсу жыцця чалавека. Старыя людзі кажуць: «Зароды Божэ жыто да на новэ літо, будэ в нас хліб, то будэ і жытло», або «З'іш хлеба і більш ныц нэ трэба».

Ад нівы і да выпечкі хлеба існавала шмат павер'яў і прыкмет. Напрыклад, меркавалі, што, калі шмат спараных жытнёвых каласкоў, то гэта значыць, што русалкі па ніве хадзілі і яе трэба абавязкова ратаваць. Аднак як ратаваць ніву ніхто ўжо не ведае. Гэтае пытанне патрабуе вывучэння і ўдасканалення.

Рэчы, пры дапамозе якіх апрацоўвалі хлеб, таксама маюць сімвалічнасць і сакральнасць.

Абрад «Серпавідзец», які бытуе на тэрыторыі Іванаўскага раёна і выконваецца напрыканцы зімы, у лютым, таксама мае сваё дачыненне да хлеба, але ўжо з другога пункту гледжання. Гэты абрад прысвечаны святому Захару Серпавідцу. Вядома, што ён у адным са сваіх прарокавых адкрыццяў убачыў скрутак, які лятаў па паветры, нагадваючы па форме велізарны серп. Таму ў дзень памяці святога сяляне шмат увагі надавалі гэтаму інструменту. Жанчыны-жнеі маліліся Захару аб добрым ураджаі, з каморы даставалі сярпы, аглядалі, чысцілі, тачылі і акраплялі вадохрышчанскай вадой. У сувязі з гэтым казалі: «нэ тады сэрпы тачыть, колы на жніво істы»; «нэ обрэжэш впору крывого сэрпа, нэ націснэш в полы снопа, нэ спэчэш хлібу». Лічылася, што Захар Серпаві-

дзец убачыць старанні людзей і дапаможа ім – удыхне ў сярпы магічную сілу.

Аналізуючы гэты абрад, неабходна зрабіць выснову аб вялікай сувязі касмічнага і зямнога суіснавання чалавека. Праз космас чалавек атрымлівае моц і сілу дзеля паляпшэння, дабрабыту і шчаслівага жыцця. Многія носьбіты традыцыі сцвярджаюць, што ўсе рэчы, звязаныя з хлебам, маюць сваю сімвалічнасць і такую ж сілу, як і хлеб у светапоглядзе заходніх палешукоў.

Як бачым, хлеб цесна звязаны з сімвалічнасцю рэчаў і прылад, якімі ён апрацоўваецца. Такой прыладай з'яўляецца не толькі серп, але і печ як месца нараджэння хлеба. Некаторыя носьбіты традыцый і сёння кажуць пра тое, што печ – то матухна, а хлеб – то бацюхна. Печ у традыцыйнай культуры палешукоў сімвалізуецца як маці хлеба, бо, менавіта, як яна прыгатаваная, такі атрымаецца і хлеб. Гаспадыні да гэтай рэчы заўсёды ставяцца вельмі ашчадна, прымаючы яе за члена сям'і. Пры выпечцы хлеба яны самі падрыхтоўваюць печ і саджаюць у яе бохан хлеба без прысутнасці іншых асоб і дамачадцаў. Гаспадыні шчыра вераць у тое, што як яны будуць абыходзіцца з печчу, так яна ім і аддзячыць, падорыць добрыя і ўдалыя боханы хлеба. Выпякаўся хлеб выключна на дубовым лісце і сімвалізаваў моц жыцця і даўгалецце.

Існуе шмат выслоў'яў, звязаных з хлебам менавіта ў сямейна-бытавым плане. І сёння можна пачуць такую гаворку сярод палешукоў «Хліб – батько, а зэмля – матухна». Сэнс гэтай гаворкі звязаны з тым, што хлеб – заўсёды галоўная спажыва чалавека, а зямля – гэта карміцелька, якая дапамагае быць хлебу на стале. Сімволіка хлеба цесна звязана з сямейна-роднаснымі адносінамі. Неад'емнай часткай у палескай культуры з'яўляецца выхаванне дзяцей паважаць хлеб. Гэта прасочваецца праз шматлікія традыцыйныя рытуалы, якія тлумачацца верай у багацце нованароджанага дзіцяці і ў яго далейшым ашчадным стаўленні да апрацоўкі нівы і вытворчасці хлеба.

Шматлікія навукоўцы сцвярджаюць, што маламу дзіцяці ў якасці пустышкі давалі кавалачак хлеба, закручаны ў тканіну. Лічылася, што хлеб дасць моцы і здароў'я. А калі адбывалася першае рытуальнае купанне немаўляткі, то абавязкова ў ночвы сыпалі зерне або клалі невялікі кавалачак хлеба. Гэты рытуал быў скіраваны на здароўе дзіцяці і яго далейшае багацце. Аналізуючы выхаванне дзяцей, трэба зрабіць выснову аб ашчадным стаўленні да вытворчасці і апрацоўкі хлеба. Ужо з маленства бацькі вучылі дзяцей апрацоўваць хлебную ніву, старанна карыстацца прыладамі працы, не пакідаць дробкі ад хлеба на стале і не раскідваць іх.

У некаторых мясцовасцях Заходняга Палесся можна пачуць наступнае: «Жыто то жызнь – хліб яе лёс». На нашу думку, гэтае выслоўе таксама мае архаічны сэнс, бо звычайна пры выпечцы абрадавага хлеба існавала шмат прыкмет на далейшае жыццё таго чалавека, якому гэты

хлеб расчыняецца і пячэцца. Гэтае вераванне назіраецца звычайна ў вясельнай абраднасці заходніх палешукоў.

У аг. Моталь Іванаўскага раёна і да сённяшніх дзён існуе выключная і непаўторная традыцыя выпечкі вясельнага каравая, якая занесена ў Спіс нематэрыяльных каштоўнасцей Беларусі. Дадзеная традыцыя адрозніваецца ад іншых багаццем рытуальных дзей і ўнікальнасцю выпечкі і ўпрыгожвання. Многія мотальскія каравайніцы сцвярджаюць, што каравай павінен выпякацца толькі праверанымі жанчынамі і тайна, каб ніхто з іншых аднавяскоўцаў і дамачадцаў не змог нашкодзіць працэсу выпечкі, бо гэта звязана з лёсам будучай сям'і. Напрыклад, існуе такое меркаванне, што ў печ каравай саджала галоўная каравайніца без прысутнасці іншых, сачыць за яго выпечкай павінна толькі яна.

Некаторыя каравайніцы паведамляюць: «Пэклы коровая і пэрэтрымалы, дый згорів той коровай. Тоді сталы мысыты нового, вставылы в піч, а він знызу горыть, а звэрху сырый. От і получылоса, шо і тыпэр в гэтоі сэм'і нэмае дэтэй» – расказала адна з удзельніц народнага фальклорнага ансамбля «Мотальскія суседзі». Гэты калектыў адрадзіў традыцыю выпечкі вясельнага каравая.

Палешукі глыбока вераць у існаванне света продкаў і адзначаюць, што ўсе выпадкі, звязаныя з хлебам, гэта своеасаблівыя знакі, якія пасылаюць на зямлю продкі таго роду, на які скіравана рытуальная дзея.

З трапяткім і глубока душэўным асэнсаваннем хлеб выкарыстоўваецца і ў памінальна-пахавальнай абраднасці палешукоў. Гэта праяўляецца ў некаторых дзеяннях дамачадцаў падчас выканання рытуальных дзей пахавальна-памінальнай цырымоніі. Так, на стол, які ставіцца ў галаве дамавіны, кладуць бохан свежага хлеба і ставяць запаленую свечку ў пасудзіну з жытам. Свечка гарыць да той пары, пакуль нябожчык знаходзіцца ў хаце, а пры вынасе яго з жытла свечку тушаць, а зерне рассыпаюць па хаце і двары ўслед за дамавінай. Хлеб, які кладуць на стол у некаторых рэгіёнах Заходняга Палесся, знаходзіцца на стале да саракавога дня пасля смерці нябожчыка, а ў некаторых выносіцца з хаты самым старэйшым мужчынам з родзічаў і нясецца да самых могілак, а потым раскрышваецца птушкам. Гэтыя рытуальныя дзеі скіраваны на абярэг сям'і і роду ад іншых бед.

Лічыцца, што жыта – гэта сімвал жыцця, якое павінна заставацца ў хаце пасля смерці дамачадца, а хлеб – гэта сімвал цела Ісуса Хрыста, які з'яўляецца спадарожнікам чалавека на зямлі і адпраўнікам яго на той свет. Некаторыя носьбіты мясцовых традыцый сцвярджаюць, што пры кармленні птушак памінальным хлебам палешукі праз іх маюць сувязь з продкамі і Богам. Існуе меркаванне, што птушкі перадаюць прывітанні продкам пры пералёце ў вырай, таму і крышыўся хлеб менавіта ім, каб праз матэрыяльнае далучыцца да сакральнага і патубаковага свету.

На сучасным этапе сімволіка і семантыка хлеба не страціла сваёй актуальнасці і жыццесцвярджальнай сілы. Хаця хлеб і не выпякаецца

цяпер у хатняй печы, а купляецца ў краме, але ж яго моц засталася нязменнай у жыхароў Заходняга Палесся, якія працягваюць захоўваць традыцыі, звязаныя з хлебам, і выкарыстоўваюць іх у паўсядзённых жыццёвых абставінах па сённяшні дзень.

Адным з такіх захавальнікаў і папулярызатараў сімволікі хлеба на тэрыторыі Заходняга Палесся з'яўляецца знакаміты палескі майстар Іван Супрунчык з вёскі Цераблічы Столінскага раёна, які ў сваіх драўляных скульптурах яскрава адлюстраваў сімвал хлеба як сімвал чалавечага жыцця.

У шэрагу драўляных скульптур хлеб атаясамліваецца з агнём, вадой і сонцам – першаснымі рэчамі і з'явамі для існавання і жыццядзейнасці чалавека. У заходнепалескай культуры гэтыя сімвалы заўсёды сустракаюцца як адзін цэлы і непарушны комплекс. Гэтая з'ява цалкам заключана ў вобраз і фактуру хлеба, які сваім круглым выглядам сімвалізуе кола жыцця, што праяўляецца ў шматлікіх абрадавых дзеяннях сямейна-бытавога цыкла.

Пра кола жыцця, звязанае з хлебам, існуе шмат вераванняў і традыцыйных рытуальных дзей, якімі і сёння карыстаюцца сучасныя палешукі. Напрыклад, паўсюдна на тэрыторыі Заходняга Палесся існуе «закон дзевяці каласоў» як сімвал кругавароту жыцця. Тлумачыцца ён вельмі проста, але мае складаную сімволіку і семантыку.

Кожная гаспадыня на працягу ўсяго жыцця захоўвае ў чырвоным куце дзевяць каласоў жыта, якія потым выкарыстоўвае ў рытуальных дзеях, звязаных з сямейна-бытавой абраднасцю. Падчас першага купання немаўляці некалькі каласкоў кладуць у ночвы, а з астатніх вытрушчваюць зерне і засяваюць у глебу. З новых снапоў бяруць тых самых дзевяць каласкоў, асвячаюць ў царкве і кладуць у чырвоны кут. Па такім самым семантычным коле каласкі выкарыстоўваюцца ў вясельнай і пахавальнай абраднасці. Неабходна зрабіць выснову аб кругавароце жыцця праз хлеб. Адна яго частка выкарыстоўваецца падчас абрадаў, а другая пераходзіць на новае кола жыцця.

«Пока круціцца хлебнае кола, то жыве палескі народ»: так паведамляе сам Іван Супрунчык, чалавек, які занатаваў гэтае кола ў сваіх драўляных скульптурах. Гэтыя традыцыі варта захоўваць і як мага часцей выкарыстоўваць у сімвалічнай і архаічнай сямейна-бытавой абраднасці дзеля таго, каб яны не страцілі сваёй практычнай і абярагальнай функцыі.

Хлеб як абярэг чалавека ад смерці, прасочваецца ў рэдкім і ўнікальным абрадавым дзеянні «перадачы хлеба» падчас пахавальнай абраднасці на Століншчыне. Носьбіты фальклорнай традыцыі сцвярджаюць, што гэты абрад бытуе на тэрыторыі Столінскага і Пінскага раёнаў па сённяшні дзень і мае свае сімвалічныя карані і адметнасці. Пры вынасе дамавіны з хаты на парозе праз дамавіну перадаецца адзін бохан хлеба ў хату, а другі бохан з хаты. Гэтая дзея азначае сімвалічны сэнс хлеба як

абярэга сям'і, у якой здарылася гора, ад смерці. Гэтай дзеі Іван Супрунчык прысвяціў цэлую кампазіцыю, якая вучыць нас быць ашчаднымі і трапяткімі ў адносінах да хлеба.

Хлеб для жыхароў Заходняга Палесся быў, ёсць і будзе невычэрпнай скарбонкай народнай мудрасці, звычаяў, вераванняў і традыцый. Гэта не толькі прадукт харчавання, які надае моц і сілу чалавеку для далейшага існавання, гэта сімвал жыцця, якому заходнія палешукі надаюць важнае значэнне і ўнікальны высокі статус. Сіла хлеба параўноўваецца з сілай рэлігіі і веры.

Вывучаючы і даследуючы семантыку хлеба, трэба зрабіць выснову аб яго ўнікальнай жыццесцвярджальнасці для палешукоў, яго непаўторнай карысці як у духоўным, так і ў матэрыяльным сэнсе. Дзякуючы звычаям, вераванням і рытуальным дзеям, звязаным з хлебам, заходнепалеская культура мае багатую мінуўшчыну, ганарыцца сваёй этнакультурнай спадчынай і верыць у шчаслівую будучыню праз захаванне і перадачу ўсіх тых каштоўнасцей, якія засталіся ёй ад продкаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Бирих, А. К.* Словарь русской фразеологии : ист.-этимол. справочник / А. К. Бирих, В. М. Мокиенко, Л. И. Степанова ; С.-Петерб. гос. ун-т. – СПб. : Фолио-Пресс, 1998. – 700 с.

2. *Красных, В. В.* «Свой» среди «чужих»: миф или реальность? / В. В. Красных. – М. : Гнозис, 2003. – 375 с.

3. *Куркина, Л. В.* Славянские этимологии / Л. В. Куркина // Этимология, 1981. – М. : Наука, 1983. – 192 с.

4. Русский народ. Его обычаи, обряды, предания, суеверия и поэзия : в 2 кн. Кн. 2 : Части 3, 4. – М. : Терра : Книжная лавка – РТР, 1996. – 318 с.

5. *Макарава, І. В.* Этымалогія слова «хлеб» [Электронны рэсурс] / І. В. Макарава. – Рэжым доступу: https://nsportal.ru/ap/library/literaturnoetvorchestvo/2015/03/23/etimologiya-slova-hleb. – Дата доступу: 24.03.2021.

6. Хлеб – традыцыйная ежа беларусаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/budze-khleb-budze-i-pesnya.html. – Дата доступу: 10.03.2021.